**Петухова Каміла**

# **Плача матуліна сэрца**

За гады Вялікай Айчыннай вайны
загінуў кожны трэці беларус.
Сайт «Архівы Беларусі»

Плача матуліна сэрца…

Мама глядзіць у акенца,
Позірк з дарогі не зводзіць,
Плача матуліна сэрца,
Думкі панурымі ходзяць.

Дзе ж ты, сыночак, падзеўся?
Дзе твае ясныя вочы?
Ранак зарой заірдзеўся,
Пацалаваўшыся з ноччу.

Узяўшы катомку на плечы,
Ты ўзышоў на пагорак,
Час мяне болей не лечыць –
Цяжка матуліна гора.

Мне ты тады ўсміхнуўся:
«Мама, не плач, я не доўга,
Хутка дадому вярнуся,
Я даю слова сынова!»

Выканаў свой абавязак
І парадніўся з вайною.
Многа салдат лягло разам
У зямельку сырую з табою.

Я ж з табой разам хадзіла,
Сыначка мой, у атаку,
Разам з табою я біла
Гітлераўскага сабаку.

Я, як магла, засланяла
І зберагала ад куляў,
Бога маліла, не спала,
Каб яны сэрца мінулі.

Раны твае я гаіла
Ды на сябе іх прымала,
Вельмі цябе я любіла
І па начах успаміналa.

Як ты на свет, сын, з’явіўся,
Першыя кволыя крокі,
Як ты ў школе вучыўся,
Рос, як дубочак, высокі.

Не зберагла, не змагла я,
Не засланіла я грудзі,
Куля прабіла іх злая –
Больш майго сына не будзе!

Сонца цяпер не такое,
Ужо мне яно не смяецца,
Не абагрэе вясною,
Плача матуліна сэрца.

Мама ж вайне шле пракляцце –
Не ажывіць толькі сына…
Нізкі паклон табе, маці,
Простая наша жанчына!